Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 11(345)** **25 САКАВІКА 1998 г.**

80 гадоў БНР

Святкаванне 80-х угодкаў БНР у Менску 22 сакавіка пачалося з масавага шэсця ад плошчы Якуба Коласа і закончылася святочным мітынгам каля Опернага тэатра. У шэсці і мітынгу прыняло ўдзел больш 10 тысяч чалавек з усёй Беларусі.

На мітынгу, які вёў Юрась Беленькі было зачытана пасланне Зянона Пазняка, зварот Рады БНР. Выступілі відныя палітычныя і грамадскія дзеячы Беларусі: Лявон Баршчэўскі, Алесь Бяляцкі, Тацяна Ваніна, Анатоль Сідарэвіч, Павел Севярынец, Станіслаў Багданкевіч, Станіслаў Шушкевіч і іншыя. Мітынг прыняў рэзалюцыю.

Урачыстыя мерапрыемствы ідуць і ў іншых гарадах Беларусі. Угодкі БНР адзначылі Ліда, Смаргонь, Бабруйск, Барысаў і шмат іншых населеных пунктаў.

25 сакавіка ў Менску ў палацы культуры ААТ "Сукно" -- урачысты сход і святочны канцэрт.



Менск.22 сакавіка 1998 г.(*здымкі Уладзіміра Хрышчановіча*)

Зварот Рады БНР да ўсіх беларусаў свету

Запалім свечку памяці надзеі

Суродзічы! Доўгі пакутлівы шлях да абвяшчэння 25 сакавіка 1918 года незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі адзначаны магіламі лепшых сыноў Беларусі. Іх светлая памяць у кожным беларускім сэрцы спалучаецца з надзеяй на лепшую будучыню нашай Бацькаўшчыны. Заклікаем усіх, каму дарагія ідэалы незалежнасці Беларусі, запаліць увечары 25 сакавіка 1998 года ў вокнах сваіх дамоў свечкі і выставіць бел-чырвона-белыя сцяжкі, як сімвалы памяці, змагання і веры.

Дзень добры, паважаная рэдакцыя.



Вашу газету пачаў чытаць адносна нядаўна з другога нумара гэтага года, пасля добрай рэкламы ТБМ і самога "НС" у маёй любімай газеце "Наша Ніва". Газета , ваша , мне шчыра кажучы , спадабалася, раней пастаянна купляў , а цяпер падпісаўся.

Быць можа ў "Нашага Слова" ёсць шмат недахопаў, але ёсць і шмат чаго цікавага, чаго чакаем з нецярпеннем і гэта пры тым, што толькі становіцца на ногі, мацнее, з'яўляецца кола аўтараў. Найбольш удала атрымліваецца ў вас знаёміць чытача з "Аповесцю пра словы","З чужой моўнай практыкі" (гэта вельмі карысная рубрыка не толькі для літаратара , але і для звычайнага чытача, бо добра і правільна валодаць беларускаю моваю павінен кожны ГРАМАДЗЯНІН Рэспублікі), а яшчэ з культурным аглядам, палітычнымі падзеямі.

І яшчэ пісалі вы аднойчы, што ёсць у вас план наконт пашырэння аб'ёму газеты, з'яўлення на яе старонках TV - праграммы - гэта канешне ўздыме і наклад і попыт сярод чытачоў. Але не ўсё так проста. Вы бачылі прыклад "Свабоды" (цяперашніх " Навінаў"): якой файнай была газета ў 1994 годзе, калі нават рэклама і тая ж TV - праграмма былі не толькі па-беларуску, а, нават, на "тарашкевіцы" і што сталася з газетай пазьней, калі пагнаўшыся за накладам газета страціла свой стыль, почырк. Канешне цяжка захоўваць стыльнасць калі " фіга ў кішэні працёрла дзірку". Але ёсьць прыклад іншых газет - "Наша Ніва", "Пагоня", можна аднесьці сюды і ЛІМ. Так, што пашырэннем, думаю, трэба пачакаць, пакуль працуйце над тым, каб на гэтых чатырох старонках не было "белых плямаў", каб чытач чытаў нумар ад назвы выдання да прозвішча рэдактара. Так, што творчых вам посьпехаў.

З павагай Уладзя,
студэнт, г. Мар'іна Горка

"Наша слова" чытаюць у Канадзе

Газета "Наша слова" карыстаецца ўсё большай папулярнасцю. Менавіта зараз, калі яна стала выходзіць у аднаўленым выглядзе. Тое, што такія выданні патрэбныя і цікавыя, можа, яшчэ не зусім усвядомілі мае суайчыньнікі, зацікаўленыя рускамоўнымі газетамі ды чарговымі тэлесэрыяламі. Але ўсё ж такі газета "Наша слова" ўжо знайшла, на маю думку, і свайго чытача, і свайго аўтара. Нядаўна я атрымала ліст ад слыннага беларуса, неардынарнага і цікавага чалавека, беларускага дзеяча, вымушанага больш за пяцьдзесят год жыць удалечыні ад Бацькаўшчыны — Барыса Рагулі.

Падаю вытрымку з ягонага ліста: "Хацеў бы выпісаць "Нашае слова", але не ведаю, як пачаць падпіску. Парадзьце, што рабіць !"

На жаль, у Канаду, дзе зараз жыве спадар Рагуля, па падпісцы "Наша слова" даслаць пакуль што нельга. Але шаноўны спадар Рагуля газету будзе атрымліваць. Кожны тыдзень я дасылаю яму чарговы нумар.

Дарэчы, акрамя таго, што мая сям'я выпісвае гэтую газету, некалькі нумароў мы купляем у шапіках, каб падараваць сваім сябрам, якія яшчэ не ведаюць пра існаванне "Нашага слова". І я ведаю, што гэтак робяць многія мае знаёмыя і сябры. Часта газету даводзіцца шукаць, бо ў некаторых шапіках яна бывае ўжо раскупленай.

Праўда, па статыстыцы "Саюздруку" калі-нікалі выходзіць, што нумароў у шапіках засталося больш, чым было туды завезена. Але гэта - так бы мовіць — парадоксы сучаснага жыцця.

Лілея Сазанавец, 19 сакавіка 1998 г. г. Ліда.

Беларускія рабочыя падтрымліваюць родную мову.

11 сакавіка на Менскім трактарным заводзе адбыўся ўстаноўчы сход суполкі Таварыства беларускай мовы. На сходзе прысутнічалі каля 20 сяброў, а па нашых спісках каля 30. Створаную суполку назвалі "Беларус". Рабочым другіх прадпрыемстваў прапануем падтрымаць наш пачын. На сходзе вырашылі вывучаць родную мову, сапраўдную гісторыю Беларусі, яе культуру, ладзіць экскурсіі, вандроўкі, творчыя сустрэчы і г.д.

Менчан, якія працуюць на МТЗ і падзяляюць нашыя ідэі, любяць Беларусь мы запрашаем запісацца ў нашу суполку. У перспектыве плануем стварыць завадскую Раду ТБМ. Жадаючым запісацца просім тэлефанаваць:

2-48-49-65
Старшыня суполкі
Уладзімір Латушкін
2-30-15-23
намеснік старшыні
Яўген Максімаў.

Віталь Базылёў.

Перарэгістрацыя працягваецца !

— Магілёўская гарадская Рада — 6 суполак, 500 сяброў.

— Віцебская абласная Рада, у якой перарэгістраваны Рады Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Полацкага, Ушацкага раёнаў, гарадоў Віцебска, Оршы, Полацка, Наваполацка.

Растуць шэрагі сяброў ТБМ.

Утварылася суполка ТБМ у Уздзенскім раёне пры раённым літаратурным аб'яднанні "Нёманец".

Старшынёй абраны настаўнік Міхась Малашэвіч. Што цікава, на Уздзеншчыне, калысцы многіх беларускіх літаратараў, дагэтуль ніколі не існавала арганізацый ТБМ.

Вітаем адважных пачынальнікаў, жадаем поспехаў на ніве адраджэння роднай мовы.

Сакратарыят ТБМ імя Ф.Скарыны

Дзень беларускай паэзіі ў Польскім Доме.

15 сакавіка Лідская арганізацыя Саюза палякаў Беларусі арганізавала Дзень беларускай паэзіі. У Лідскі Дом Паляка былі запрошаны мясцовыя аматары і майстры паэтычнага слова. Свае вершы чыталі Станіслаў Суднік, Леапольд Пырскі, Міхась Мельнік, Юры Карэйва, Віктар Бачароў, Іван Гушчынскі. Спяваў бард Сяржук Чарняк. На заключэнне выступіў фальклёрны ансамбль Лідскага педвучылішча пад кіраўніцтвам Ганны Гайдукевіч. Пры поўнай зале беларускае паэтычнае слова і народныя песні панавалі у Доме Паляка больш трох гадзін.

Весткі з сядзібы ТБМ

13 сакавіка Кастрычніцкая Рада ТБМ і ТБШ правялі сустрэчу з вядомым гісторыкам Міколам Ермаловічам, прымеркаваную да 80-х угодкаў БНР.Прысутнічалі школьнікі, студэнты, рабочая моладзь. Вёў імпрэзу Ян Грыб.

Закончыўся збор матэрыялаў на конкурс "Беларусь маімі вачыма". Журы прыступіла да аналізу сачыненняў і творчых работ.

Адбыліся чарговыя паэтычныя сустрэчы ў музеі Я.Купалы. Прысутныя сустрэліся з паэтамі Славамірам Адамовічам і Сяргеем Вераціламі. Студэнты Беларускага універсітэта запрасілі літаратараў сфатаграфавацца на памяць.

У сядзібе ТБМ з-за неаплаты рахунка за элнктраэнергію ЖРЭА Партызанскага раёна без папярэджання адключыла святло. Сакратарыят шукае магчымасць выплаты запазычанасці.

Сакратарыят атрымаў ліст ад Сяргея Язерскага, актыўнага сябра адмысловага клуба "Спаемства". Аўтар, псіхолаг, запрашае ўсіх жадаючых да размовы, імкнецца падзяліцца сваім досведам работы па прагараме пашырэння беларускай мовы ў побытавым жыцці. Тэлефон "Спаемства" для кантакту 235-80-96 г. Менск..

Ахвяраванні на ТБМ

Прадпрымальнікі Маскоўскага р-на г. Менска	- 2 млн. рублёў
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя "Народная Грамада"	- 4 млн. 500 тыс. рублёў
Баранавіцкая рада ТБМ	- 1 млн. 500 тыс. рублёў
Ж.В.Я.	- 200 тыс. рублёў
Барыс Бароўскі	- 100 тыс. рублёў
В.Ф.Ляшэнка	- 200 тыс. рублёў
С.В.Купрыянава	- 50 тыс. рублёў
Іван Сотнікаў	- 50 тыс. рублёў
С.І.Бабенка	- 150 тыс. рублёў
Леанарда Мухіна і яе вучні 3 "Г" класа СШ № 37 г. Менска	- 190 тыс.рублёў
Вучні 10 "А" класа СШ № 5 г. Маладэчна	- 100 тыс.рублёў
Алесь Карповіч, Латвія	- 150 тыс.рублёў
Георгі Таразевіч	- 220 тыс.рублёў
Супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта	- 1 млн. 600 тыс.рублёў
Алесь Сабаленка	- 200 тыс.рублёў
Віктар Сцяпановіч	- 500 тыс.рублёў
Павел Бурдыка	- 100 тыс.рублёў
Уладзімір Шчур, Горкі	- 100 тыс.рублёў
Васіль Петруковіч	- 100 тыс.рублёў
Лія Іванова	- 100 тыс.рублёў
А.Ю. Канановіч	- 100 тыс.рублёў
Н.В.Гімпель	- 50 тыс.рублёў
С.Ф.Цыбульскі	- 50 тыс.рублёў
С.Ф. Кныровіч	- 50 тыс.рублёў
А.В.Пашкевіч	- 20 тыс.рублёў
Ю.П.Фастовіч	- 50 тыс.рублёў
Васіль Петруковіч	- 100 тыс.рублёў
Святаслаў Палівода, Маладэчна	- 400 тыс.рублёў
І.В.Фурсовіч, Докшыцы	- 40 тыс.рублёў
К.П.Анісава, м. Свіслач Пух. р-н	- 50 тыс.рублёў

Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны выказвае шчырую ўдзячнасць за дапамогу і просіць перасылаць ахвяраванні на рахунак **3015212330014** код **764** у Гардырэкцыі Белбізнесбанка г.Менска.

БНР мусяць прызнаць і афіцыйныя ўлады Беларусі.

Зараз, калі ўсе свядомыя грамадзяне Беларусі і нашыя суайчыннікі за мяжой святкуюць 80-я ўгодкі БНР, цікава азнаёміцца з думкай на гэты конт сённяшніх прадстаўнікоў прэзідэнтскай каманды.

Нядаўна ў свет выйшаў маленькім накладам вельмі цікавы зборнік калектыва аўтараў начале з ўсім вядомым Іванам Антановічам.

"Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў." Т.1 (1917-1922гг.) (Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы). Мн.:БелНДІДАС, 1997 - 398 с.

Зборнік уключае дакументы і матэрыялы, якія паказваюць геапалітычнае становішча Беларусі ў перыяд ад Лютаўскай (1917г.) рэвалюцыі ў Расеі да ўтварэння СССР, адносіны суседніх краін і дзяржаў свету да праблемы нацыянальна-дзяржаўнага вызначэння беларускага народа, характарызуюць яго пакутлівы лёс у перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, нямецкай і польскай акупацый, сведчаць аб намаганнях лідэраў нацыянальнага руху па стварэнні самастойнай і незалежнай Беларускай Рэспублікі.

Прывядзём адтуль цытату прысвечаную падзеям 1917 - 1918 г.г. на Беларусі, якія непасрэдна звязаны з нараджэннем БНР.

"Палітычная абстаноўка ў Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. была складанай і супярэчлівай. Шмат беларускіх нацыянальных арганізацый і іх кіруючых органаў, якія прызналі Савецкую ўладу ў Расіі, не прызналі яе ў Беларусі. Гэта не адпавядала інтарэсам большасці насельніцтва краю, якое ўжо падтрымлівала Савецкую ўладу.

Ідэю аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі падтрымаў і Першы Усебеларускі кангрэс (снежань 1917г.). Але ён быў разагнаны, як піша Ю. Туронак, "за яго імкненне стварыць на беларускай зямлі свой, беларускі орган Савецкай улады, замест прэтэндуючых на яе чужых камісараў", якія не прызнавалі беларускай нацыі і яе права на самавызначэнне. Гэта было першае сур'ёзнае сутыкненне бальшавікоў і нацыянальнай апазіцыі, якая змагалася за ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці.

Разгон кангрэса даў моцны імпульс эвалюцыі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ад аўтаноміі да ўстаноўкі на поўнае аддзяленне ад Расіі. Гэтаму садзейнічалі і іншыя важныя грамадска-палітычныя фактары і абставіны: расійска-нямецкія перамовы, а затым і заключэнне Брэсцкага міру, які вызначыў лёс Беларусі і беларускага народа без уліку іх інтарэсаў і без іх удзелу; абвяшчэнне Украінскай Народнай Рэспублікі, Літоўскай і Эстонскай рэспублік. Развіццё падзей у снежні 1917 - сакавіку 1918 г.г. і асабліва антыбеларуская пазіцыя Расіі і Германіі канчаткова ўпэўнілі кіраўнікоў нацыянальнага руху ў неабходнасці стварэння самастойнай беларускай дзяржавы.

Мірныя перамовы паміж дзяржавамі германскага блоку і Савецкай Расіяй, якія праходзілі ў Брэст-Літоўску, мелі непасрэдныя адносіны да лёсу Беларусі. Аднак яе прадстаўнікі не былі дапушчаны на перамовы. Хоць на запыт Усебеларускага кангрэса (снежань 1917г.) аб магчымасці пасляць сваіх прадстаўнікоў у Брэст Л.Д.Троцкі адказаў, што лёс беларускага народа не будзе вырашацца без уліку яго інтарэсаў. Ён прызнаў паўнамоцтвы ўкраінскай дэлегацыі, але адмовіў беларускім прадстаўнікам ва ўдзеле ў перамовах.

3 сакавіка 1918 г. мірны дагавор быў падпісаны на ўмовах, якія прапанавала Германія. Ён фактычна ўзаконіў акупацыю часткі тэрыторыі Беларусі. Яе тэрыторыя была падзелена па лініі Дзвінск-Свянцяны-Ліда-Пружаны-Брэст. Тэрытарыяльныя ўступкі Германіі за кошт Беларусі дазволілі захаваць Савецкую ўладу ў Расіі. Але гэта было і першае значнае паражэнне бальшавіцкага курсу на сусветную рэвалюцыю.

Пасля падпісання і ратыфікацыі Савецкай Расіяй Брэсцкага міру ў беларускім нацыянальным руху дамініруючай стала тэндэнцыя да незалежнасці.

Важным крокам у яе рэалізацыі з'явілася прыняцце Выканкомам Рады Усебеларускага кангрэса 21 лютага 1918 г. Першай Устаўнай граматы да народаў Беларусі, а 9 сакавіка 1918 г. - Другой Устаўнай граматы, якой абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка — самастойная, суверэнная дзяржава з шырокімі дэмакратычнымі правамі грамадзян. Трэцяй Устаўнай граматай БНР дэкларыравалася "незалежнай вольнай дзяржавай" і абвяшчалася аб разрыве дзяржаўных сувязей з Расіяй. Гэтым актам выказваўся намер перагледзець умовы Брэсцкага мірнага дагавора ў дачыненні да Беларусі.

Такім чынам была абвешчана БНР. Але незалежная, суверэнная рэспубліка абвяшчалася на тэрыторыі акупіраванай кайзераўскай Германіяй. А ў яе планы не ўваходзіла стварэнне ці прызнанне беларускай дзяржаўнасці. У Брэсцкім мірным дагаворы Беларусь як нацыянальны рэгіён нават не ўспаміналася. А па Дадатковым руска-германскім дагаворы, які быў падпісаны 27 жніўня 1918 г., Германія абавязвалася не падтрымліваць "самастойных дзяржаўных арганізмаў" на занятай тэрыторыі і не ўмешвацца ў адносіны паміж рускай дзяржавай і яе асобнымі абласцямі".

Пры ўсіх намаганнях урада БНР Германія не прызнала незалежнасці Беларусі. Яе яна разглядала як частку Савецкай Расіі і па ўмовах Брэсцкага міру не магла без згоды апошняй прызнаць Беларускую дзяржаву.

У тых умовах многія беларускія дзеячы добра разумелі, што магчымасць існавання рэспублікі ў рашаючай ступені залежала ад Германіі. Таму 25 красавіка 1918 г. частка лідэраў беларускага нацыянальнага руху вымушана была звярнуцца з тэлеграмай да германскага кайзера Вільгельма II.

Аднак, як адзначае вядомы даследчык гісторыі беларускай дзяржаўнасці В.А.Круталевіч, палітыка Германіі ў гэтым пытанні далёка не высветлена. Поўнаму аднаўленню карціны беларуска-германскіх адносін 1918 г. дапамогуць нямецкія архівы, якія беларускімі гісторыкамі практычна не вывучаны.

У той жа час кіраўніцтва Заходняй вобласці РСФСР працягвала заяўляць аб тым, што толькі яно з'яўляецца законным прадстаўніком і абаронцам інтарэсаў беларускага насельніцтва. Абласны цэнтр не прызнаваў правоў беларусаў на самавызначэнне і стварэнне сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці. Хаця да таго часу Расія прызнала правы польскага народа на незалежную суверэнную дзяржаву, былі ўтвораны Украінская, Літоўская, Латвійская і Эстонская савецкія рэспублікі. 1 студзеня 1919 г. абвешчана Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь."



Дзеляць Беларусь.Расейска-нямецкія перамовы ў Бярэсці.

Гэты вялікі урывак з вышэйзгаданага зборніка сведчыць аб тым, што гістарычная праўда, як яе не ўтойвалі бальшавікі зараз паступова прызнаецца ўсімі.

Нават для гісторыкаў улады відавочна, што бальшавікі ад самага пачатку і да самага свайго канца не ўспрымалі ўсур'ёз беларускі народ і Беларусь. Для іх нашая Радзіма заўсёды была разменнай картай у іхніх палітычных гульнях. Выгадна было аддаць немцам — аддалі, выгадна — палякам аддалі. Выгадна - - далі шэсць паветаў, выгадна — дадалі. Далі Беласточчыну -- забралі, далі Вільню — забралі і г.д. Усё гэта прыкрывалася камуністычнымі ідэямі, але нарэшце самым заангажаваным палітыкам Беларусі становіцца зразумелым, што гэта быў самы нахабны і паскудны гандаль нашым народам. Праўда нарэшце даходзіць да людзей

Таму я не сумняваюся, што 100-угодкі БНР будзе святкаваць увесь беларускі народ у вольнай, незалежнай, дэмакратычнай і заможнай Беларусі.

Алег Трусаў,
кандыдат гіст. навук

ЭТНІЧНАЯ МОВА – ГРУНТ ПАТРЫЯТЫЗМУ.

Гуманітарызацыя ёсць адукаванасць, чалавечнасць. Выкладчык прызваны выхаваць патрыёта сваёй Бацькаўшчыны. Беларускі патрыятызм ёсць стыхійная, прыродная, ірацыянальная з'ява. Ён аб'ядноўвае людзей ад калыскі да смерці ў лоне сваёй нацыі на аснове псіхічна-маральных і светапоглядных адносінаў, якія збліжаюць сяброў нацыі, яднаюць іх у адзіную вялікую супольнасць. Асноўнымі рысамі беларускага патрыятызму з'яўляецца жаданне жыць на сваёй Бацькаўшчыне, любоў да роднай зямлі, прыхільнае ўспрыманне беларускай культуры, свабодалюбства, павага да чалавека, шанаванне традыцыяў, абрадаў.

Выдзелім два віды беларускага патрыятызму: свядомы і падсвядомы. Падсвядомы або стыхійны патрыятызм гэта любоў да роднай прыроды, сваіх землякоў, мовы, традыцый, звычак. Важную ролю пры гэтым адыгрывае прывычка. Чалавек жыве сярод адпаведнага акружэння, прывыкае да яго так, што лічыць яго сваёй часткай.

Родная мова для любога чалавека з'яўляецца асновай патрыятызму і светапогляду, яна захоўвае і перадае традыцыі свайго народа. Натуральна, выхаваўча-вучэбны працэс у ВНУ павінен весціся ў Беларусі на беларускай мове. Беларуская мова для беларуса ёсць самы каштоўны скарб і спосаб самазахавання як інтэлектуальнай асобы. Выдатны педагог К.Ушынскі сцвярджаў, што мова ёсць скарбніца народа, у якой адлюстравана прырода, у асяроддзі якой ён жыве, светапогляд і вера народа. Ён пісаў, што страта мовы для народа раўназначна знішчэнню нацыянальнасці (этнасу). Выбітны філолаг А. Поцебня ў вядомай працы "Мова і мысленне" даказаў, што паміж роднай мовай, мысленнем і псіхікай паводзінаў існуе моцная арганічная повязь. Нават падсвядома любоў беларуса да Беларусі, беларускай мовы выцякае з таго, што беларус арганічна зросся з роднай прыродай, сваімі землякамі, сям'ёй, роднымі, суседзямі, з нацыянальнымі традыцыямі, светапоглядамі і боскай першаасновай — роднай мовай.

Для пераходу ад падсвядомага да свядомага патрыятызму неабходна са здаровым гонарам адчуць сваю прыналежнасць да канкрэтнай нацыі і асэнсаваннасць адметнае адрозненне ад іншых нацыяў (чым васілёк адрозніваецца ад ружы). Чалавек, які дакладна ведае асаблівыя рысы свайго народа, яго гісторыю, культуру, асэнсаваў неабходнасць вярнуцца і жыць у роднамоўным асяроддзі і ёсць свядомы патрыёт.

Кожны народ, як і асобны чалавек, мае пазітыўныя і негатыўныя рысы, амаль кожны народ мае ў сваёй гісторыі цёмныя яе старонкі. Але сапраўдны патрыёт любіць і бароніць Бацькаўшчыну ў цэлым, а не адварочвацца ад яе толькі таму, што яго народ мае (ці яму знешняй сілай прышчэплены) нейкія негатыўныя рысы, ці дапускаў нейкія памылкі ў сваёй гісторыі.

Выбітны патрыёт не абмяжоўваецца пасіўнай любоўю да свайго краю,народа, да яго сучаснага і мінулага, да яго мовы і культуры. Ён актыўна працуе для свайго народа, прагнучы вярнуць родную мову народу, падняць яго культуру і дабрабыт, перамагчы яго адмоўныя рысы і весці да самаўдасканалення. Ён бароніць гонар Беларусі, калі хто-небудзь ганьбіць яе, і мае сваю адказнасць за сваё прызначэнне. Самаахвярная любоў да Бацькаўшчыны-Беларусі з'яўляецца найвышэйшай формай патрыятызму. Гэта выражаецца ў тым, што чалавек для дабрабыту свайго народа цярпіць мукі і нават ідзе на смерць.

Татальная русіфікацыя ўсіх сфераў грамадскага жыцця, разбурэнне беларускамоўнага інфармацыйнага асяроддзя, недапушчэнне на ўзроўні кіраўніцтва дзяржавы беларускамоўнага выкладання ў ВНУ патрабуе назваць беларускую мову галоўнай перашкодай знішчэння беларускай нацыі. Захаванне беларускай мовы неабходна дзеля таго, каб выратаваць беларускі этнас ад рэальнага этнацыду. Мы павінны добра ведаць метады ганебнай палітыкі "раздзяляй і валодай", прысваення сабе ўсіх каштоўных здабыткаў паняволеных народаў, матэрыяльнага і культурнага рабаўніцтва. Гістарычна найнебяспечнейшыя для беларусаў палітычныя ідэі Расеі: федэрацыі, місіянства Расеі над Беларуссю, адзінства славян, "адзінай першаснай рускай народнасці". Гэта шлях поўнай асіміляцыі беларусаў і знікнення этнасу.

Нацыянальнасвядомая інтэлігенцыя ў Беларусі ў меншасці. Але ж ва ўсе часы развіцця цывілізацыі перамагала меншасць, узброеная перадавымі, прагрэсіўнымі ідэямі. Сіла і моц інтэлігенцыі не ў колькасці, а ў яе якасці. Тая частка інтэлігенцыі, якая прыстасоўваецца да ўмоў духоўнай акупацыі ці антынароднай палітычнай кан'юнктуры, лёгка адракаецца ад сваіх пазіцый. Ядром гетэрагентнасці беларускай інтэлігенцыі з'яўляецца мімікрыя і пятая калона.

Характар і вартасць інтэлігента асабліва яскрава праяўляецца ў канкрэтных справах на пераломах гістарычнага і рэвалюцыйнага працэсу. Ва ўмовах духоўнай рэзервацыі беларусаў у Беларусі нават выкладчыку беларускай мовы і літаратуры, каб быць беларусам (жыць 24 гадзіны ў суткі ў роднамоўным беларускім асяроддзі), патрабуецца мужнасць, а, можна казаць, і подзвіг.

Прафесар Мікола Савіцкі. 14.03.98г.

Найвышэйшы ўздым нацыянальнага руху.

Сёлета спаўняецца 80 гадоў з дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. БНР — заканамерны вынік усяго папярэдняга развіцця беларускага нацыянальнага руху, лагічны крок на шляху ад тэрэтычнай выпрацоўкі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці да яе практычнай рэалізацыі.

Кіраўнікі Беларускай Дзяржавы сваю мэту бачылі ў тым, каб злучыць наш край у адзіны цэласны, нацыянальна незалежны арганізм, сабраць і арганізаваць перш у стройную сістэму нацыянальна-дзяржаўнай еднасці ўсе свядомыя і творчыя сілы.

Абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці з'яўляецца сведчаннем найвышэйшага ўздыму Беларускага нацыянальнага руху. Але разам з тым абвяшчэнне БНР было толькі пачаткам нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва.

Адразу пасля абвяшчэння БНР Рада БНР атрымала пэўную падтрымку на месцах. У гарадах, мястэчках па ініцыятыве беларускай мясцовай інтэлігенцыі стварыліся гарадскія і павятовыя рады. Так у Магілёве мясцовую Раду ўзначаліў Міхал Кахановіч, у Бабруйску — Антон Аўсянік, у Радашковічах — ксёндз Аўгусціновіч. На пачатку красавіка 1918 года Народны Сакратарыят Беларусі наведалі дэлегацыі Барысава, Бабруйска, Слуцка, Нясвіжа, Койданава, Радашковіч, Навагрудскага павету і іншых месц. Мэтай гэтых дэлегацый было ўстанаўленне цеснага кантакту з Радай БНР і інфармаванне правіцы пра працу вышэйшых органаў Рэспублікі.

Дзеля таго, каб садзейнічаць стварэнню Беларускіх радаў на месцах і рэгуляваць іх дзейнасць, 20 красавіка 1918 года Народны Сакратарыят выдаў "Часовы наказ мясцовым Беларускім Радам."

У наказе адзначалася, што "Беларускія Рады маюць мэтай дзяржаўную незалежнасць Беларусі, развіццё і паўсюдные пашырэнне беларускай культуры".

Менавіта ў сферы культуры ствралася трывалая аснова дзеля пашырэння беларускай нацыянальнай ідэі.

У пачатку красавіка 1918 года Народны Сакратарыят Беларусі прыняў пастанову, паводле якой беларуская мова аб'яўлялася абавязковай дзяржаўнай мовай Беларусі, а "ўсе, дакументы і перапіска урадавых установ павінны былі весціся на дзяржаўнай беларускай мове".

Важнай сферай дзейнасці Народнага Сакратарыяту было адраджэнне беларускай нацыянальнай школы. На гэтым шляху сустракаліся вялікія цяжкасці. Па-першае, адчувалася вострая недахоп настаўнікаў па-другое — не хапала падручнікаў.

3 красавіка 1918 года Народным Сакратарыятам Асветы БНР былі адкрыты курсы беларусазнаўства. Курсы былі бясплатныя, у канцы красавіка іх наведала больш 200 чалавек. Курсы закончыліся 15 чэрвеня. А з 1 ліпеня 1918 года працавалі штотыднёвыя курсы для народных настаўнікаў у Бабруйску. 5 верасня 1918 года па ініцыятыве Народнага Сакратарыяту адбылося сумеснае адкрыццё ў Менску Беларускіх настаўніцкіх курсаў і курсаў беларусазнаўства для настаўнікаў гарадской пачатковай школы. У чэрвені 1918 года ў Менску працавала 20 беларускіх пачатковых школ, а ўсяго ў 1918 годзе дзейнічала больш за 350 пачатковых беларускіх школ. З 15 кастрычніка 1916 года па 15 лістапада 1918 года тут было падрыхтавана 144 настаўнікі для беларускіх школ.

6 і 7 жніўня 1918 года на Дзканальным з'ездзе Дзісненскага Дэканату было пастаноўлена, каб у Дэканаце парафіяльныя школы былі з беларускай мовай выкладання. Дзейнічалі беларускія гімназіі ў Будславе і Слуцку.

22 красавіка 1918 года па ініцыятыве М.А.Вярата была адкрыта Вышэйшая музычная школа, рээрганізаваная па распараджэнні Народнага Сакратарыята Асветы ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю.

Вырашылася пытанне з выданнем школьных падручнікаў. Было створана выдавецкае таварыства "Заранка", якое мела на мэце выданне кніг для пачатковай школы, для студэнтаў і вучняў вышэйшых школ. Народным Сакратарыятам Асветы былі падрыхтаваны і выпушчаны падручнікі па геаграфіі, арыфметыцы, хрэстаматыя па літаратуры, "Зборнік п'ес", "Зборнік нот".

Было створана спецыяльнае "Бюро па ўкладанню і перакладах падручнікаў на беларускую мову", якое ў 1918 годзе пеадрыхтавала да друку 16 школьных падручнікаў.


Справа з выданнем кніг паступова наладжвалася, аб чым сведчыць праведзеная ў пачатку ліпеня 1918 года выстаўка кніжнага штукарства. Усяго ў 1918 годзе было выпушчана каля 50 кніг.

У справе пашырэння і паглыблення самасвядомасці моцным сродкам з'яўляўся тэатр. 19 мая 1918 года "Першае таварыства беларускай драмы і камедыі" было рээрганізавана ў Дзяржаўны тэатр БНР на чале з Ф.Ждановічам. Народны Сакратарыят выдзяляў штомесячную субсідыю на ўтрыманне тэатра. Тэатр выязджаў на гастролі ў Магілёў, Бабруйск, Слуцк, Оршу, Жлобін і іншыя дробныя мястэчкі на Віленшчыне і Меншчыне. Часта трупа брала з сабою беларускую літаратуру для распаўсюджвання, якую бралі нарасхват.

Урад БНР прыкладаў намаганні для вяртання на Беларусь бежанцаў, рэгістраваў іх грамадзянамі БНР, а з лета 1918 года дзейнічаў агульнаграмадзянскі пашпарт БНР. Беларуская Народная Рэспубліка мела такія атрыбуты дзяржаўнасці, як дзяржаўная пячатка і герб "Пагоня", зацверджаныя ў ліпені 1918 года. У гэтым жа годзе БНР атрымала юрыдычнае прызнанне з боку Украіны

Абвяшчэнне БНР з'явілася падагульненнем папярэдняга развіцця беларускага нацыянальнага руху. Сам факт стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі сведчыў пра тое, што беларускі народ у сваім развіцці дасягаў такога ўзроўню, на якім стала магчыма стварэнне беларускай дзяржаўнасці.

Валянцін Мазец, кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.



Два асяродкі ідэі незалежнасці

Пад час 1-й сусветнай вайны і падзелу тэрыторый Беларусі Расейска-Германскім Фронтам склаліся два палітычныя асяродкі беларускага нацыянальнага руху: Вільня, на акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі і Менск, дзе асабліва развіваўся беларускі нацыянальны рух пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ў Расеі. У Вільні разам з ідэяй стварэння федэральнай летувіска-беларускай дзяржавы група "Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі" начале з Вацлавам Ластоўскім выступала за поўную дзяржаўную незалежнасць і тэрытарыяльную цэльнасць Беларусі ў яе этнаграфічных межах. У Менску сярод беларускіх дзеячаў спачатку пераважалі аўтанамічныя настроі, прапанавалася абвяшчэнне Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі са сваім войскам, але ў складзе Расейскай Федэрацыі Народаў. На дэмакратычна абраным Усебеларускім з'ездзе (Кангрэсе), які прадстаўляў інтарэсы розных груповак у беларускім нацыянальна-адраджэнскім руху і ўсіх пластоў беларускага народа асноўнае пытанне самавызначэння Беларусі не было вызначана. Прыхільнікі Вялікай Беларускай Рады, якія складалі прыкладна палову дэлегатаў выказаліся за абвяшчэнне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі, а прыхільнікі Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім савеце сялянскіх рабочых і жаўнерскіх дэпутатаў з сядзібай ў Петраградзе заставаліся на пазіцыях захавання Беларускай Рэспублікі ў складзе Расейскай Федэрацыі. З'езд быў хутка разагнаны мясцовым бальшавіцкім кіраўніцтвам начале з Мясніковым, якое не толькі адмаўляла самавызначэнне Беларусі, але не прызнавала існавання самой беларускай нацыі.

Незалежніцкія настроі пашыраліся пад час перамоваў савецкай дэлегацыі з нямецкай аб міры што вяліся ў Бярэсці. Савецкія ўлады дамаўляліся аб лёсе Беларусі, не дапускаючы прадстаўнікоў беларускага народа да перамоваў. Незалежніцкія настроі ў менскім асяродку ўзмацніліся пасля разгону Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 года і ўхвалення гэтага разгону 3-м Усерасейскім з'ездам саветаў у студзені 1918 года.

Усебеларускі з'езд, як легальны орган улады паспеў абраць Раду з'езду начале з Язэпам Лёсікам, якая стала юрыдычнай пераемніцай усёй паўнаты ўлады з'езду. Рада стварыла 22 снежня 1917 года або 3 студзеня 1918 года па новаму стылю Выканаўчы (Спаўняючы) Камітэт Рады Усебеларускага з'езду начале з Язэпам Варанкам які павінен быў заняцца беларусізацыяй Саветаў у краіне і ўзяць уладу ў свае рукі ў адпаведны момант. Выканаўчы Камітэт быў правобразам урада Беларусі. Аднак у пачатку 1918 года ён дзейнічаў у паўлегальных, а часам і нелегальных умовах. Пасля ўцёкаў бальшавікоў з Менска 19 лютага 1918 года перад прыходам германскіх войскаў Выканаўчы Камітэт Рады выйшаў з падполля і стаў легальным органам улады ў Беларусі.

21 лютага 1918 года ў вольным Менску Выканаўчы Камітэт Рады выдаў 1-ю Устаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі для кіравання краем і склікання як можна хутчэй Усебеларускага Устаўнога Сойму на аснове агульнага права для ўсякага дарослага, не лічачыся з нацыянальнасцю, вызнаннем і родам. Выканаўчы Камітэт стварыў першы беларускі ўрад - Народны Сакратарыят Беларусі начале з Язэпам Варонкам, надаўшы яму выканаўчую ўладу ў краіне.

Нямецкія войскі занялі Менск і амаль усю тэрыторыю Беларусі. Нямеччына заключыла з савецкім урадам Расеі Берасцейскі мір і не прызнала беларускую ўладу, бо паводле Берасцейскага міру беларуская тэрыторыя лічылася Расейскай. Да таго Гародня і тэрыторыі на летувіскім памежжы былі адрэзаны ад Беларусі. Нямецкія акупацыйныя ўлады адмоўна паставіліся да беларускага нацыянальнага ўрада.

25 лютага 1918 года аддзел нямецкіх жаўнераў заняў будынак Народнага Сакратарыяту Беларусі на Плошчы Волі ў Менску. Паводле загаду свайго афіцэра жаўнеры зрабілі вобшук і забралі касу. З будынка яны знялі беларускі бела-чырвона-белы сцяг. Пазней, на пачатку красавіка 1918 года нямецкія ўлады заявілі аб забароне дзейнасці Народнага Сакратарыяту.

Тым не менш Рада З'езду і Выканаўчы Камітэт працягвалі дзейнічаць. Грунтуючыся на ідэях Усебеларускага з'езду і 1-й Устаўной граматы Выканаўчы Камітэт Рады 9-га сакавіка 1918 года выдаў 2-ю Устаўную грамату, якая абвясціла стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікай, як дэмакратычнай парламенцкай — дзяржавы. Асноўныя законы павінен быў вызначыць Устаноўчы Сойм Беларусі, які выбіраўся паводле ўсеагульнага роўнага, простага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права. Да склікання дэмакратычна абранага Ўстаноўнага Сойму, які ва ўмовах акупацыі абраць было немагчыма, улада заставалася ў руках Рады Ўсебеларускага з'езду, а выканаўчая і адміністрацыйная ў руках Народнага Сакратарыяту. Грамадзянам БНР гарантаваліся ўсе дэмакратычныя правы.

18 сакавіка 1918 года Рада Ўсебеларускага з'езду на пленарным паседжанні абвясціла сябе Радай БНР. Такім чынам яна ўзяла на сябе функцыі парламента, сталася вышэйшым заканадаўчым органам краіны. У перыяд паміж плянарнымі паседжаннямі Рады БНР вышэйшым органам дзяржаўнай улады з'яўляўся яе Прэзідыум на чале са старшынёй Рады, або Прэзідэнтам рады. Выканаўчы Камітэт рады спыніў сваё існаванне. Аднак 2-я Устаўная грамата не вырашала пытанняў незалежнасці і тэрыторыі БНР...

... У гэты час беларускія палітычныя дзеячы ў Вільні дзейнічалі больш рашуча ў незалежніцкім кірунку. Яшчэ 25-28 студзеня 1918 года яны правялі Беларускую канферэнцыю з прадстаўнікоў акупаваных Германіяй на той час беларускіх тэрыторыяў. Беларуская канферэнцыя абрала Віленскую беларускую раду, прадстаўнічы орган беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый на акупаванай яшчэ ў 1915 годзе тэрыторыі Заходняй Беларусі. Старшынёй Рады быў абраны Антон Луцкевіч. У сувязі з абвяшчэннем 16 лютага 1918 года незалежнасці Летувіскай рэспублікі Віленская беларуская рада цалкам заняла незалежніцкую пазіцыю. 19 лютага 1918 года яна прыняла пастанову, паводле якой дзяржаўная сувязь Беларусі з Расеяй была разарвана. Вілейская беларуская рада вітала абвяшчэнне БНР у Менску. 18 сакавіка шэсць сяброў Вілейскай беларускай рады, у тым ліку Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Янка Станкевіч, Язэп Туркевіч былі каптаваны ў склад Рады БНР і 23 сакавіка прыехалі ў Менск ...

Анатоль Грыцкевіч, прафесар, доктар гістарычных навук

Беларусь – наш Дом

Восемдзесят гадоў таму амаль усе народы Расейскай імперыі зрабілі спробу аднаўлення або утварэння сваёй дзяржаўнасці, спробу выйсці на самастойны шлях развіцця, каб жыць у сваім Доме. Рэалізаваць сваё святое, дараванае Богам права жыць па сваіх законах тады удалося толькі фінам і палякам. Сёння нават немагчыма параўнаць дабрабыт народаў Польшчы і Фінляндыі з народамі Расейскай Федэрацыі і краін СНД. Тое, што ў Фінляндыі і Польшчы жывуць лепш, чым у Расеі або на Беларусі, сёння не аспрэчвае ніхто. Гэты факт успрымаецца, як аксіёма і гаворыць аб неабходнасці палітычнай самастойнасці краіны. Галандыя нашмат уступае Беларусі па прыродных рэсурсах, аднак галандцы жывуць лепш, чым беларусы. Гэта яшчэ адзін факт на карысць незалежнасці.

25 сакавіка 1918 г. была ўтворана Беларуская Народная Рэспубліка, якая праіснавала некалькі месяцаў. Пасля акупацыі нашага краю бальшавіцкімі войскамі кіраўнікі Крамля стварылі ССРБ, а потым і БССР. Гэтае марыянеткавае ўтварэнне ніякай самастойнасці не мела. Аднак ідэі БНР заклалі падмурак для БССР і нашай сёняшняй дзяржаўнасці. На вялікі жаль, іх рэалізаваць не удалося. Яны і сёння захавалі сваю актуальнасць.

Рада пацвердзіла ўсе правы і свабоды грамадзян, якія абвяшчалі ІІ-ой Устаўной граматай ад 9 сакавіка, слова, друку, сходаў, забастовак, сумлення, недатыкальнасці асобы і жылля, права на аўтаномію, раўнапраўе моў усіх нацыянальнасцяў Беларусі. Зацвярджаўся 8-гадзінны рабочы дзень. Лясы, воды і нетры зямлі аб'яўляюцца ўласнасцю БНР, зямля застаючыся у прыватнай уласнасці, павінна была бясплатна перадавацца тым, хто яе апрацоўвае.

Як бачым, большасць правоў і свабод яшчэ неабходна нам рэалізаваць.

25 Сакавіка — Дзень Волі. Гэта свята не толькі для беларусаў, а і ўсіх грамадзян нашай краіны. Беларусь — наш Дом. Усе жыхары нашага краю "павязаныя" аднымі праблемамі. Усе сацыяльныя выплаты праводзяцца з дзяржаўнага бюджэту. І абкрадванне нашай агульнай скарбонкі прыводзіць да абкрадвання кожнай сям'і, кожнага з нас. Па радыё "Свабода" перадалі цікавы факт. Са слоў А.Р.Лукашэнкі, запазычанасць Беларусі Расеі складае 120 млн.дал., а доўг Расеі Беларусі 1 мільярд дал. Значыць, расейская завінаваачанасць большая за беларускую у некалькі разоў. Я думаю, у гэта можна паверыць. Вобразна кажучы, нават немагчыма уявіць, што заяц можа пакрыўдзіць ваўка, а Беларусь – Расею.

Неабходна стаць вышэй нацыянальнай абмежаванасці і бараніць наш агульны Дом — Беларусь. Палітычная самастойнасць Беларусі дае права і магчымасць нашай краіне выбіраць, што для народа выгадна, а што і не. Права выбару — найвялікшая каштоўнасць незалежнасці. Падтрымліваючы раўнапраўныя, узаемавыгадныя партнёрскія адносіны з Расеяй і другімі краінамі свету, сувярэнная Беларусь можа адмежавацца ад крывавых авантур Крамля. Беларускаму народу не патрэбны ваенныя канфлікты — розныя "афганістаны", "таджыкістаны", "чэчні" і г.д.

Усякія саюзы Беларусі з Расеяй звужаюць магчымасць выбару для нашай краіны. Пры аб'яднанні ў адну краіну адносіны будуць ажыццяўляцца ў форме дыктату "старэйшага брата". Гэтага нельга дапусціць.

Усе хочуць жыць добра. Многія стараюцца любой цаной павысіць свой дабрабыт. Прыстасавацца да існуючай сістэмы здольны не многія. Эміграваць могуць толькі багатыя і таленавітыя. Іншых проста не прымаюць. У беднай краіне абсалютная большасць людзей будуць жыць у галечы. Сярод гэтай большасці амаль усе рабочыя. Найважнейшая умова дабрабыту — гэта палітычны статус роднага краю. У гісторыі не было багатых калоній. Толькі свая дзяржава багатая! Краіна здольна забяспечыць сваім грамадзянам Дабрабыт. Лёс працоўных звязаны з лёсам краіны. Вось чаму, незалежна ад нацыянальных, палітычных, канфесійных і другіх адметнасцяў нашых грамадзян, усім нам неабходна абараніць наш агульны Дом — нашу родную Беларусь.

Найважнейшай, неабходнай умовай для развіцця нашага краю з'яўляецца свабода, незалежнасць, сувернітэт Рэспублікі Беларусь. Рэалізацыя ідэй БНР павысіць дабрабыт кожнай сям'і, кожнага з нас.

Галай Аркадзь, рабочы МТЗ

Госці з паэтычнай Уздзеншчыны.

Віктар Сабалеўскі

У сярэдзіне лютага ўтульная зала музея Я.Купалы была асабліва ажыўленай. На чарговыя паэтычныя сустрэчы прыехала група паэтаў літаратурнага аб'яднання "Нёманец" з Узды. Ідэя прыехаць у Менск і выступіць перад аматарамі паэзіі зарадзілася на адным з пасяджэнняў літаб'яднання, а рэалізацыя яе была нескладанай. І вось ужо менчукі акунуліся ў асаблівую пявучасць уздзенскай гаворкі.

Адчувалася хваляванне пачынаючых паэтаў: сталічная зала ўяўлялася патрабавальнай і катэгарычнай. Але ўтульнасць Купалавага дамка, шчырасць слухачоў, добрая ўважлівасць вядучага Генадзя Бураўкіна растапілі халадок адчуджанасці і выклікалі адчуванне еднасці. Усіх зніталава любоў да паэтычнай песні, роднага слова.

Вершы Юркі Ясеня (сапр. Міхась Малашэвіч) захапілі разнастайнасцю, шырынёй пачуццяў, узнёсласцю, гумарам. Адчувалася настаўніцкая назіральнасць, досвед працы з людзьмі рознага ўзросту, нязмушаная любоў да сваіх вучняў, павага да людзей сталага веку, гады і здароўе якіх з'ела цяжкая сялянская праца.

Віктар Сабаленка, намеснік рэдактара раённай газеты, запаланіў слухачоў сваімі гумарыстычнымі і сатырычнымі вершамі. Такога рогату, відаць даўно не чулі гэтыя сцены, прывычныя да лірычнай споведзі. Героеў сваіх вершаў Віктар шукае ў нашым жыцці — растрэсеным, няўклюдным, і рабілася страшнавата: як жа шмат іх, гарлапаністых, хамаватых, хцівых, недалёкіх, каля нас.

Прыемна здзівіў усіх Віктар Кіслы, прыватны прадпрымальнік. Відаць, калі людзі гандлёвай сферы жывуць у палоне паэтычнага радка, хай сабе і расейскай мовы, то не так блізка яшчэ і прызямленне Беларусі на чорную выспу бездухоўнасці. Вершы Віктара захаплялі, зачароўвалі, але, як сказаў Генадзь Бураўкін, Беларусь мае шмат паэтаў, хто піша па-расейску, але ніхто з іх не стаў Паэтам, бо самазямля наша ёсць і калыска, і крыніца роднага слова, і яна ўзносіць абраных дачок і сыноў да недасяжных вышынь яго.

Сярод выступоўцаў было шмат настаўнікаў, і гэта дало спадзяванне, што іх вучні, сагрэтыя неабыякавасцю, чуласцю радка настаўніцкага верша панясуць у жорсткі свет моцу ўлагоджанасці і дабрыні. Якраз пра гэта думалася, калі гучалі вершы Зінаіды Жукоўскай і Валянціны Рогач. У нечым адметныя, чымсьці падобныя, яны неслі асаблівую пяшчоту жаночай лірыкі.

І ўжо, калі здавалася, вяршыні ўсе пакораныя, калі нават самі ўзденцы — і школьніцы, і сталыя — былі ў захопе ад незвычайнага гучання прывычных радкоў на сталічнай сцэне, залу ўскалыхнуў прыгожы, з нейкімі асаблівымі тужліва-светлымі пераліваміі голас Зоі Калкоўскай. Яна спявала пра сінія вочы Беларусі, пра шчымлівую любоў да людзей яе, пра рэальнае і нязведанае. І гэты нечакана цудоўны спеў узняў залу ў адзіным парыванні слухаць і слухаць музычны маналог госці з паэтычнай Уздзеншчыны.

І не хацелася нам, гараджанам, развітвацца, не хацелася адрывацца ад цудоўнай, натуральнай, вясковай гамонкі нашых гасцей, што прывезлі з палёў уздзенскіх глыток нашага слова, настоенага на жытнёвых каласах, прапахлага смалой і кменам. Таму і развітанне было спадзяванкай на сустрэчы. І гэтае чаканне спраўдзілася. Ужо праз некалькі тыдняў мне патэлефанаваў Міхась Малашэвіч і паведаміў, што створана суполка Таварыства беларускай мовы, у якую ўвайшлі ўсе сябры літаб'яднання "Нёманец". І стала светла на душы, што яшчэ адна жменька высакародных і ўлюбёных у наша слова засеялася на нашай ніве.

Людміла Дзіцэвіч , намеснік старшыні, сакратар ТБМ.

Юрка Ясень

Я думаю...

Я думаю, якія трэба сілы
Каб сёння жыць,
Калі Чарнобыль апастылы
Атруту запускае ў жылы —
Жывымі пачынаем гніць.

Я думаю, якія трэба сілы,
Каб так трываць
Хоць за капейку рвём мы жылы
Адной нагой ужо ў магіле,
А "дзякуй" хочацца казаць.

Я думаю, якія трэба сілы,
Каб жыць сляпым
Штодзень скрыпець,
як крыж пахілы,
Вяроўкі з нас, народзе мілы,
Ўюць, каб звязаць вузлом адным.

Я думаю, якія трэба сілы,
Каб жыць нямым
Мо языкі папрыкусілі
Мо кроў крывіцкую прапілі
А мо ўжо гэта і не мы?

ЧАМУ ТАК БЫВАЕ ?

Чаму, скажыце, так бывае
На гэтым свеце, крыху дзіўным:
Сябры прыходзяць і знікаюць,
Нам пакідаючы ўспаміны,
Ну а ўсялякае брыдоцце
Мазоліць вочы ўсім гадамі,
Хоць часам дома, на рабоце
І называюць іх "сябрамі"?

Чаму сумленных, шчырых, простых
Так дружна ўсе дзяўбуць і чубяць,
А падхалімаў ды прахвостаў
У важных кабінетах любяць ?
Чаму , не маючы улады —
Ён чалавек, як чалавек,
Але, дабіўшыся пасады,
І над сябрамі творыць здзек ?

Ці не таму вось і жывецца
Нам з кожным годам усё горш:
Той паміраe, той — сап'ецца,
Апошні выкінуўшы грош.
А іншы думае: навошта
Я буду лезці на ражон ?
Лепш стану жыць я ціха, проста,
Пакуль не пруць з работы вон.

Таму не дзіўна, што смяюцца
Суседзі з браткі-беларуса,
Гамоняць так: "Глядзіце, людцы,
Назад ён пнецца без прымусу,
Старых багоў навыбіралі,
З былых кагорт — кіраўнікі.
Чаго хацелі прычакалі,
І лёс вам суджаны такі..."

Зінаіда Жукоўская

* * *

Зноў вяртаюцца дадому гусі
З тых далёкіх чужых краін
На прасторы мілай Беларусі,
Да лясоў, рачулак і рабін...

І садзяцца на лугі ў знямозе,
Прывітанне шлюць сваёй зямлі,
А яна да іх ідзе ў трывозе,
Птушкі гэта ведаць не маглі.

Родная замелька стогне, плача, —
Яе смог чарнобыльскі накрыў.
Пэўна, Бог нас пакараў, няйначай,
Нашу радасць кінуў пад абрыў.

Столькі ранаў у зямлі балючых !
Столькі горкіх і жахлівых сноў !
Лекар - час, дай зёлкаў ёй гаючых,
Падбяры замову з добрых слоў.

Сэрца, не трымці ,не плачце, вочы !
Божа міласцівы, памажы !
І няхай трывога дні і ночы,
Не стаіць сурова на мяжы !

Каб вярталіся дадому гусі,
Плывучы над квеценню садоў,
І прасторы роднай Беларусі
Іх заўсёды вабілі дамоў !

АПОВЕСЦЬ ПРА СЛОВЫ

Тытунь, табака, махорка, люлька.


Не выключана, што слова ***тытунь***, альбо ***тытун***, трампіла на Беларусь праз украінскую мову, дзе яно гучыць як ***тютюн***. Але слова ***тытунь*** ёсць і ў балгарскай мове, і ў іншых славянскіх мовах Балканаў. Трапіў сюды тытунь ад туркаў і назва яго ***цюцюн*** прыйшла разам з ім. Адкуль і як слова ўзялося ў туркаў нам знайсці пакуль не пад сілу.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы вызначае, што тытунь не толькі расліна сямейства паслёнавых, але і "высушанае і дробна парэзанае лісце і сцёблы гэтай расліны, якія ідуць на курэнне". Прычым у якасці прыкладаў філолагі прыводзяць "люльку набітую тытунём".

Слова ж ***табак*** прайшло іншы шлях. Табак разам са сваёй індзейскай назвай трапіў Іспанію ў 1518 годзе пасля адкрыцця Амерыкі. Адтуль ён пайшоў па Еўропе. Па-французску гэтае слова гучыць, як ***tabac***, па-нямецку-- ***der Tabak***, па-польску -- ***tabak*** і ***tabaka***. З Польшчы табака пранікла на Беларусь, а пад час расейска-ліцьвінска-польскай вайны 1634 года пранік у Расею. Розумазаключэнні накшталт таго, што слова ***табак*** пранікла да нас з расейскай мовы не маюць падставаў.У першым, асноўным сваім значэнні, табака вызначаецца як "парашка-падобны тытунь для нюхання". З гэтым словам звязана беларуская прымаўка "Ні за нюх (панюх,панюшку) табакі".

Звычка нюхаць тытунь пашыралася на Беларусі ў другой палове XVIII ст., у часы раздзелаў Рэчы Паспалітай, калі тэрыторыя Беларусі была пастунова анексавана Расеяй.

Пазней з Францыі да нас трапіла і іншая расліна "нікатына рустыка", ніжэйшы гатунак тытуню. Далікатным французам гэты гатунак тытуню не падабаўся і яны



Менскія люлькі XVII - пачатку XVIII ст.ст.

казалі пра яго: *amer fort (амэр фор)*, што азначае горка-моцны. Назва *"амарфорны тытунь"* хутка ператварылася ў нас у ***"махорны тытунь"***, а затым у *махорку*.

Цалкам верагодна, што ў XVII ст. украінскія казакі прынеслі на Беларусь не толькі слова ***,тытунь***, але і чырвонагліняныя люлькі, і само слова ***люлька***, бо па-украінску гэтае слова гучыць так сама, па-балгарску -- ***,лула***, ну а ўжо на турэцкае гучанне выбачайце.

Люлька — выраб, які прадназначаны для курэння тытуню. Люлькі выраблялі з гліны, косці і выразалі з дрэва. На тэрыторыі Беларусі вядома з канца XVI-пачатку XVII ст.ст. Першыя люлькі завозіліся на Беларусь з краін Заходняй і Паўднёвай Еўропы (Галандыя, Бельгія, Турцыя і інш.). Разам з капшуком люлька складала частку мужчынскага традыцыйнага народнага адзення беларусаў. Часцей за ўсё люлькі выраблялі з гліны ў спецыяльных двухчастных раз'ёмных формах, альбо выразалі з кавалка гліны сцізорыкам, ці фармавалі іх на ганчарным крузе.

Люлька складаецца з дзвюх частак — галоўкі, або тулава — полага цыліндрычнага, скругленага знізу (каб было зручна трымаць у руцэ) і цэўкі (муштук) з гняздом для цыбука. Места для тытуню — місачка злучана з гняздом для цыбука маленькім, да 4 мм. у дыяметры прахончыкам. Памеры люляк па вышыні ад 3,5 да 6 і болей см. У XYII — XYIII стст. з'яўляецца некаль тыпаў люляк: 1 — чырвона-гліняныя, аздобленыя раслінным узорам ("валовае вока", кветачкі, ялінкі, галінкі і г.д.); 2 — дымлёныя, або "сівакі"; 3 — паліваныя, пераважна зялёнага, або светла-карычневага колераў; 4 — галанскія, белагліняныя люлькі з доўгай цэўкай яйкападобнай галоўкай і невялікай ножкай ўнізе галоўкі.

З сярэдзіны XYII ст. люлькі пачынаюць рабіць з гліны больш светлых таноў і нарэшце з фаянсу і каменнай масы. Аздабленне штампікам пастунова адмірае, а паверхня люлькі глянцуецца. Рэльеф мае як традыцыйныя геаметрычныя, так і раслінныя матывы. Люлькі рабіліся таксама ў выглядзе звяроў і зрэдку мелі антрапаморфны характар. На некаторых люльках, асабліва імпартых трапляюцца клеймы.

Собаль В., Трусаў А., кандыдаты гістарычных навук.

Часовы выканаўца абавязкаў рэдактара Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.

Рэдакцыйная рада:
Генадзь Бураўкін — старшыня,
Людміла Дзіцэвіч, Сяргей Запрудскі,
Аляксей Пяткевіч, Аляксей Рагуля,
Аляксей Саламонаў, Павел Сцяцко,
Алег Трусаў, Эрнэст Ялугін.

Аўтары нясуць поўную адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі.

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку Гродзенскага аблвыканкама.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Кошт па дамове.Газета падпісана да друку 23. 03. 98 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 850 .
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 12 000 руб., 3 мес.- 36 000 руб.